

10 лістапада старшыня Соўнаркома БССР тав. М. М. Галадзед уручыў дзяржаўную дапамогу адзінаццаці многадзетным мацерам.

НА ЗДЫМКУ: калгасніца арцелі імя Блюхера Жлобінскага раёна, тав. Зенькова М. С. атрымлівае з рук тав. Галадзеда восем тысяч рублёў. Стаяць: таварышы Леплеўскі і Бурачэўскі.

Фото Салавейчыка і Фрыдмана.

# Шчаслівыя мацеры

## ПРЫЁМ МНОГАДЗЕТНЫХ ЖАНЧЫН ТАВАРЫШАМ М. М. ГАЛАДЗЕДАМ

10 лістапада старшыня Соўнаркома БССР таварыш Галадзед прыняў групу многадзетных мацярэй, калгасніц Зянькову Марыну Сцяпанаўну (арцель імя Блюхера, Жлобінскага раёна), Окуневу Ганну Кузьмінічну (арцель «Ільіч», Бялыніцкага раёна). Касцючэнка Аўдоццю Аляксееўну (арцель «Чырвоная Барозаўка», Мазырскага раёна), Вагінскую Ганну (калгасніцу арцелі «Рэвалюцыя», Капыльскага раёна), Дабрыцкую Фёклу Міхайлаўну (арцель «Ударнік», Барысаўскага раёна), Ульянаву Настасію Гапееўну (арцель імя Тэльмана, Мехайскага раёна) і хатніх гаспадынь Гаўрыліну, жонку чорнарабочага (Жлобінскі раён), Вендраву Серафіму Лейбаву, жонку краўца з мястэчка Капыль; Казляк Ганну, жонку рабочага завода імя Кірава (Менск) Бабкову Еўгенію Спяпанаўну, жонку рабочага магілеўскай кааперацыйнай арцелі.

На прыёме прысутнічалі нарком унутраных спраў БССР таварыш Леплеўскі, нарком аховы здароўя БССР таварыш Бурачэўскі, намеснік старшыні Соўнаркома БССР таварыш Любовіч і намеснік наркома фінансаў БССР таварыш Матусевіч.

Таварыш Галадзед доўга распытваў кожную жанчыну пра жыццё ў калгасах, цікавіўся пісьменнасцю іх.

— Мы папрасілі вас у Менск,— гаворыць старшыня Соўнаркома, — каб уручыць грашовую дапамогу, якая належыць вам па закону Совецкай улады.

Мікалай Мацвеевіч напамінае многадзетным жанчынам, што гэты закон выдан па прапанове найлепшага друга народу таварыша Сталіна, і далей растлумачвае, чаму большэвіцкая партыя і Совецкая ўлада выдалі такі закон.

Пасля гэтага таварыш Галадзед уручае кожнай з 11 жанчын належачую ім дзяржаўную дапамогу. Першай падыходзіць да стала Гаўрыліна, матка 11 дзяцей і атрымлівае з рук старшыні Соўнаркома 11.000 рублёў. Усхваляваная да глыбіні душы, яна некалькі раз паўтарае:

— Дзякуй таварышу Сталіну, дзякуй, што ён палепшыў наша жыццё. «Сталін — лепшы бацька за майго роднага, бо родны бацька мяне нават не вучыў».

Сапраўды, Гаўрыліна непісьменная. Але яна, таксама як і іншыя жанчыны, дала слова таварышу Галадзеду за бліжэйшыя шэсць месяцаў навучыцца чытаць і пісаць.

Адна за адной падыходзяць да стала многадзетныя мацеры і атрымліваюць па 8, 6, 4 і 2 тысячы рублёў. Бабкова, Казачэнка, Окунева і Ульянава прыехалі ў Менск з груднымі дзецьмі. Таварыш Галадзед просіць іх не ўставаць, сядзець і падносіць кожнай належную суму дзяржаўнай дапамогі.

*З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы*

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ